База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# ДА ВЫТОКАЎ ГОРАДА НАД СОЖАМ

Наш сучаснік усе больш пільна ўглядаецца ў сваю гісторыю, поўную драматызму і вялікіх здзяйсненняў, кровапралітнай барацьбы і стваральнай працы. Каб зразумець і асэнсаваць дзень сённяшні, мы прагна імкнемся разгадаць «белыя плямы» яшчэ нядаўняга мінулага і прачытаць няпісаныя старонкі далёкай гісторыі. І, як ніколі раней, нас цікавяць нашы вытокі: мовы, пісьменнасці, матэрыяльнай культуры, дзяржаўнасці, гарадоў.

Сярэдневяковая гісторыя Гомеля поўная загадак. Частыя войны, пажары, змена гомельскіх князёў і магнатаў зусім не садзейнічалі захаванню мясцовых летапісаў і грамат. Уніклівыя гісторыкі яшчэ ў мінулым стагоддзі літаральна па крупінках сабралі разрозненыя паведамленні аб мінулым горада, якія трапілі на старонкі дайшоўшых да нашых дзён пісьменных крыніц XII—XVIII стагоддзяў. Вынікам гэтай работы была цікавая кніга Л. Вінаградава «Гомель. Яго мінулае І сучаснае», апублікаваная ў 1900 годзе. Выпушчаная невялікім тыражом, яна ўжо тады была маладаступнай для шырокай аўдыторыі. Але нават шчаслівы ўладальнік гэтай кнігі наўрад ці зможа поўна ўявіць гісторыю Гомеля, паколькі яна зведзена амаль выключна да гісторыі змены яго ўладальнікаў.

Напярэдадні 850-гадовага юбілею першага летапіснага ўпамінання Гомеля (не заснавання горада, як цяпер сцвярджаецца) актуальным становіцца глыбокае і ўсебаковае вывучэнне і асэнсаванне ўсёй сукупнасці крыніц па яго старажытнай гісторыі. І, бадай, самай складанай з'яўляецца праблема паходжання Гомеля. У вядомай меры прасвятліць гэтую загадку дапамаглі археалагічныя раскопкі абласнога музея, праведзеныя ў Парку культуры і адпачынку імя А.В. Луначарскага.

Трэці палявы сезон археалагічнага атрада аказаўся адным з самых напружаных. Раскол, закладзены каля грота «Лунны камень» у ліпені быў распрацаваны да моманту завяршэння даследавання ў кастрычніку на глыбіню 6 метраў. Удзельнікамі раскопак — школьнікамі, навучэнцамі ПТВ, студэнтамі дзяржаўнага універсітэта — старанна перабраны і вынесены з раскопу дзесяткі тон сярэдневяковага культурнага пласта, а навуковымі супрацоўнікамі атрада — А. І. Драбушэўскім, А. В. Курчыцкім, А. А. Зайчан-ка, Л. П. Ізотавым — выкананы многія метры палявых чарцяжоў, сотні фотаздымкаў і прарысовак археалагічных знаходак, рэстаўратарамі А. М. Пісарэнка і В. Н. Сулейка ажыццеўлена складанейшая работа па аднаўленню здавалася б назаўсёды прапаўшых тварэнняў нашых продкаў, якія праляжалі ў зямлі 800—1000 гадоў.

Адкрыццё рэштак гарадскіх абарончых збудаванняў XII— XIII стагоддзяў — землянога вала і рова, якія апаясвалі цытадэль летапіснага Гомія, — дазваляе зрабіць рад важных вывадаў. Па-першае, горад валодаў першакласнай для свайго часу крэпасцю, па-другое, за час сваёй гісторыі яна неаднаразова падвяргалася варожым асадам. Знойдзеныя ў пласце пажарышча XIII стагоддзя тыпова мангольскія наканечнікі стрэл — «зрэзні», не пакідаюць сумненняў у тым, што Гомій, узяты штурмам і разорены, раздзяліў лёс многіх гарадоў Русі, якія загінулі пасля мужнага супраціўлення пад ударамі орд Батыя. У ліку ўнікальных знаходак — абломкі плоскіх старажытнарускіх цаглін — плінфы. З плінфы пабудаваны славутыя Кіеўская Сафія, Чарнігаўская Пятніцкая царква і многія іншыя помнікі старажытнарускай манументальнай архітэктуры XI—XIII стагоддзяў. Сёння з поўнай падставай мы можам

сцвярджаць, што і Гомель адносіцца да ліку гарадоў, у якіх мураванае будаўніцтва пачалося 800—900 гадоў таму назад. Пошук старажытнейшых помнікаў гомельскай архітэктуры павінен стаць новей задачей археолагаў.

Культурны пласт «летапіснага» часу (XII стагоддзя) парадаваў багаццем іншых знаходак, сярод якіх — замкі, ключы, спражкі, наканечнікі стрэл, ювелірны пінцэт, абломкі візантыйскіх амфар кіеўскай шкляной пасуды, мноства жаночых упрыгажэнняў са шкла і каляровых металаў, рыцарская шпора, фрагменты кальчуг, мяча, каменны і касцяны крыжыкі і дзесяткі іншых прадметаў. Каменная насадка для верацяна (прасніца) з рэшткамі кірылаўскага надпісу — бясспрэчнае пацвярджэнне распаўсюджання пісьменнасці сярод першых гамяльчан — адносіцца да ліку унікальных сведчанняу нашей гісторыі.

Напружены рытм работы экспедыцыі дасягнуў апагея, калі на глыбіні 4—4,5 метра адкрыліся рэшткі самых старажытных гомельскіх умацаванняў, якія служылі надзейнай аховай яшчэ ў X—XI стагоддзях. Пабудаваныя ў часы легендарных радзімічаў, драўня-на-земляныя валы і равы дзвюма падковамі апаясвалі самую старую частку горада — высокі узгорак над Сожам у цэнтральнай частцы сучаснага парку. Ужо ў X стагоддзі Гомій, які вырас на месцы ўсходне-славянскіх паселішчаў IX—XI стагоддзяў, быў пасяленнем гарадскога тыпу: складаўся з дзвюх умацаваных частак, быў буйным адміністрацыйна-палітычным і ваенным цэнтрам вялікай сельскай акругі. Першыя гараджаке ўжо былі добрымі будаўнікамі, кавалямі, ювелірамі, ганчарамі, косцерэзамі, паляўнічымі, воінамі. Сярод знаходак з «далетапісных» пластоў — гліняная пасуда, шкляныя пацеркі, касцяная інкруставаная металам рукаятка нажа, жалезныя наканечнікі стрэл.

Матэрыялы апошніх раскопак канчаткова абвяргаюць меркаванне, згодна з якім Гомель узнік у 1142 годзе. Пад гэтым годам назва горада толькі ўпершыню з'яўляецца на старонках летапісу. Адлік жа гісторыі яго пачынаецца яшчэ ў X стагоддзі, з часоў славутага князя Уладзіміра Свята-славіча, празванага Святым за веліч яго дзяржаўных дзеянняў. Новыя адкрыцці дазваляюць прама паставіць пытанне аб 1000-годдзі Гомеля — аднаго са старажытнейшых гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Зацікаўленая грамадскасць мае права чакаць афіцыйнага вырашэння гэтага немалаважнага пытання.

Археалагічны атрад гатовы прадоўжыць даследаванні «белых плям» у далёкай гісторыі нашага горада і вобласці. На жаль, парыў энтузіязму ахалоджваецца надзвычай цяжкімі ўмовамі работы, змяніць якія да лепшага самаму музею не пад сілу. Супрацоўнікі экспедыцыі месяцамі працуюць у невентыліруемым падвале. Пры адключаным ацяпленні тут становіцца сыра, як у самым змрочным падзямеллі, пры ўключаным — тэмпература паветра даходзіць да 30 градусаў вышэй нуля. Перепады тэмпературы, невынішчальныя пыл і плесень пагражаюць ператварыць у прах усе вынікі карпатлівай працы навуковых супрацоўнікаў. Дык няўжо ў нашим горадзе не знойдзецца такога рабочага памяшкання, дзе могуць працаваць на яго карысць некалькі чалавек, якія імкнуцца адрадзіць ніць гістарычнай памяці, якая ідзе з глыбіні вякоў?

**А. МАКУШНІКАЎ,**
**загадчык аддзела археалогіі**
**абласнога краязнаўчага**
**музея, кандыдат гістарычных**
**навук.**